местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : Губернская тип., 1897. – 171 с.
8. Романов, Е.Р. Белорусский сборник / Е.Р. Романов. – Вып. 8: Быт белоруса. – Вильно: Б. м., 1912. – 124 с.
9. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-западного края / П.В. Шейн. – Т.1.Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – СПб.: Тип. Императорской Академии наук, 1887. – 585 с.
10. Якубінская, А.Дз. Традыцыйная сацыялізацыя дзяцей беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX стст. / А.Дз. Якубінская. – Мінск: РІВШ, 2010. – 118 с.

## БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ У ПАЧАТКУ XX СТ. І ПРАБЛЕМА БЕЛАРУСКАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

Унучак А.У. г. Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі

На пачатку XX ст. галоўныя лідэры беларускага нацыянальнага руху гуртаваліся вакол тыднёвіка “Наша Ніва”, які выходзіў у 1906–1915 гг. У няпростых умовах развіцця нацыятворчых працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. сфарміравалася “нашаніўская” ідэалогія, якая стала дамінаваць у нацыянальным руху і зрабілася вызначальнай для беларускай ідэнтычнасці. Разам з гэтым, трэба адзначыць, што адначасова з “нашаніўскай” ідэалогіяй на тэрыторыі Беларусі функцыянавалі і мелі папулярнасць “заходнеруская” і “краёвая” ідэалогіі.

Згодна з аўтарам адзінай на сённяшні дзень сінтэтычнай манаграфіі, прысвечанай “заходнерусізму”, А. Цвікевічам: “пад “заходнерусізмам” мы разумеем тую плынь у гісторыі грамадскай думкі на Беларусі, якая лічыла, што Беларусь не з’яўляецца краінай з асобнай нацыянальнай культурай і не мае дзеля гэтага права на самастойнае культурнае і палітычнае развіццё, але што яна з’яўляецца культурна і дзяржаўна часткай Расіі і таму павінна разглядацца як адзін з яе састаўных элементаў” [1, с. 7].

Працяглае знаходжанне Беларусі ў Расійскай імперыі, русіфікацыя прывялі да таго, што ў самой Беларусі сталі з’яўляецца грамадскія сілы, якія пры падтрымцы ўладаў Расійскай імперыі сцвярджалі “адвечную” рускасць краю і выключна дабратворны

уплыў Расіі на лёс Беларусі. Натуральна, што пры гэтым не магло ставіцца пытанне пра самастойную беларускую дзяржаўнасць.

З іншага боку, існавала ідэйная плынь і грамадская сіла, якая атрымала назву "краёвасць". Што тычыцца вызначэння тэрміну "краёвасць", то, на нашу думку, найбольш удалай з'яўляецца дэфініцыя А. Смаленчука: "краёвасць - гэта ідэалогія, якая была распрацавана ў Беларусі і Літве на пачатку XX ст. Яна грунтавалася на ідэі палітычнай нацыі. Краёўцы сцвярджалі, што ўсе карэнныя жыхары гістарычнай Літвы, незалежна ад іх этнічна-культурнай прыналежнасці, з'яўляюцца "грамадзянамі краю" і тым самым належаць да адзінай нацыі. Апроч гэтага, краёвасць можна трактаваць і як рысу свядомасці часткі грамадства беларуска-літоўскага краю, які стаў Радзімай не толькі для беларусаў і літоўцаў, але і для палякаў, яўрэяў, татар, рускіх. Розныя этнічна-культурныя патокі змешваліся, зліваліся і нараджалі ўнікальны тып "краёўца", які сапраўды адчуваў сябе грамадзянінам краю і мог адначасна належаць да двух ці нават да трох этнасаў" [2].

"Краёвасць" грунтавалася на ідэі адраджэння Вялікага княства Літоўскага, якое было захоплена Расійскай імперыяй у канцы XVIII ст. Пры гэтым яны сцвярджалі, што ёсць "Расія дэмакратычная" і ёсць "Расія імперская". "Краёўцы" лічылі, што кожная нацыя, якая пражывала на тэрыторыі краю, павінна мець самую шырокую культурную аўтаномію. Агульнай мовай для міжнацыянальных зносінаў павінна быць польская, як гэта было ў часы падзелаў Рэчы Паспалітай.

Такім чынам, "Наша Ніва" вымушана была лічыцца з існаваннем "заходнерусізму" і "краёвасці" ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі.

"Заходнерусы" імкнуліся давесці, што беларуская ідэя – гэта прадукт польскай справы. Трэба было абгрунтаваць барацьбу з ёй у рамках расійска-польскага супрацьстаяння, каб улада адчувала, якую вялікую небяспеку яна ўяўляе. З гэтай мэтай газета "Окраины России" звярнуліся да "генезісу" беларускага руху. Пішучы пра Галіччыну, гэтае выданне сцвярджала, што як толькі тамтэйшыя ўкраінцы, "пад уплывам палякаў", "згубілі сваю нацыянальную аснову" (безумоўна, расійскую. – *А.У.*), то адразу ж "падпалі пад уплыў сацыялістычных утопіяў". Аналагічная сітуацыя, на думку аўтара матэрыялу, які схаваўся пад псеўданімам "Белорус", была і ў

Беларусі, дзе “падрыўную працу” вяла “польская сацыялістычная партыя ў Літве”. Спачатку, пісала газета, яна ў Лондане друкавала агітацыйныя пракламацыі на беларускай мове, пасля ў Львове і Кракаве “з’явіліся беларускія “Смыкі”, “Дудкі” і “Скрыпкі”, з яскрава азначанай сацыялістычнай афарбоўкай, а пазней “партыя” перанесла сваю дзейнасць у Расію, дзе з’явіліся “Лемантары”, “Долі”, “Нівы”. “Дырыжоры” беларускага руху “завабілі ў партыю” (відаць, маецца на ўвазе БСГ. – *А.У.*) “выключаных гімназістаў і розных недавучак з народа: арганістаў, “аканомаў”, сельскіх акушэрак, настаўнікаў і г.д.” Асноўнымі падпісчыкамі “Ніў” і “Доль” былі “сельскія настаўнікі”. Відавочна, што “Окраины России” былі добра інфармаваным выданнем, бо сапраўды была рэальная сувязь беларускага руху з ППС, сапраўды апошняя дапамагала яму ў выдавецкіх праектах. Але гэта было толькі на пачатку 1900-х, да 1908 г. усялякія супольныя праекты спыніліся, і “Окраины России” не маглі пра гэта не ведаць. Такім чынам, тактыка змешвання рэальных, напаўрэальных і міфічных фактаў была заклікана паказаць штучнасць беларускага руху, яго несамастойнасць, антыдзяржаўную (сацыялізм) і антырасійскую скіраванасць [3, с. 196].

Разам з гэтым, “Наша Ніва” атрымала падтрымку ад “краёвага” выдання “Przegląnd Wileński”, які раскрытыкаваў дзейнасць “заходнеруса” Лук’яна Саланевіча, напісаўшы, што той спачатку “гуляў у “беларускасць”, а пасля адкрыта перайшоў у чорнасоценны лагер. Знакам такога пераходу было ператварэнне “Белорусского Общества” ў “Северо-Западное”. Хоць, адначасова, той жа тыднёвік выказваў сваю занепакоенасць агульным станам беларуска-польскіх дачыненняў, асабліва танальнасцю беларускай прэсы ў стасунку да палякаў. Галоўны рэдактар гэтага “краёвага” выдання Л. Абрамовіч лічыў, што паводле прынцыпу “дэмакратычнасці” палякі не маюць права праводзіць нацыянальную працу ў чыста беларускіх асяроддзях, а беларусы – у польскіх ці “адвеку спаланізаваных” [4, с. 1-2]. “Наша Ніва” адразу адказала Л. Абрамовічу, абвінаваціўшы яго самога ў “недэмакратычнасці”. Бо “дэмакратызм”, як лічыў А. Луцкевіч, – гэта “жаданне абудзіць народ да жыцця, дабіцца, каб ён свой голас даў, каб выказаў свае думкі, сваю душу”. А гэта магчыма толькі ў межах роднай культуры і на роднай мове. Беларускі рух, паводле А. Луцкевіча, пачынаўся як дэмакратычны, бо ён

ставіў “гэты вялікі і светлы ідэал вышэй за ўсялякія нацыяналізмы” [5, с. 2].

У дачыненні да шляхоў выбару грамадска-палітычнага развіцця нашаніўцы не мелі адзінства. Так, калі “Наша Ніва”, пяром А. Уласава, пачала падтрымліваць ідэі “краёвасці”, супраць гэтага катэгарычна выступіў В. Ластоўскі. Ён пісаў, што “ўласаўская” канцэпцыя толькі размывае беларускі дух. В. Ластоўскі не жадаў саступаць нават у тактычных пытаннях. Яшчэ раней ён пісаў з нагоды смерці Э. Ажэшкі: “Праўдзівай бацькоўшчынай Ажэшковай была Беларуская зямля, каторая яе ўзгадавала; з Польшчай – апрача мовы і гістарычных перажыткаў – вялікая пісьменніца мела мала супольнага” [6, с. 308].

Паводле А. Луцкевіча, “пры развіцці краёвай культуры хутчэй ідзе развіццё культуры ў кожнай нацыі” [7, с. 3]. Тым самым ён прызнаваў, што беларуская культура можа паспяхова развівацца ў “краёвым” кантэксце, а беларускі рух як частка “краёвага”. Хоць цікава, што адзін з галоўных ідэолагаў краёвасці М. Ромэр лічыў А. Луцкевіча “беларускім эндэкам”, які толькі часова супрацоўнічае з “дэмакратамі”.

Цэнтральнай арэнай ідэйнай барацьбы ў ходзе нацыятворчых працэсаў у Беларусі была мова. Менавіта з ёй звязвалася самастойнасць нацыі. “Заходнерусы” ўвесь час імкнуліся давесці, што беларускай мовы не існуе, а калі факт яе існавання пад уплывам нашаніўскага руху зрабіўся неабвержным, то пачалося змаганне за яе правы ў грамадскім жыцці.

Аднак, нягледзячы на велізарную перавагу ў рэсурсным вымярэнні расійскай і польскай нацыяналістычнай прэсы над “Нашай Нівай”, менавіта нашаніўскія ідэі ў гістарычнай перспектыве атрымалі перамогу. Гэта аб’ектыўна сведчыць аб іх большай адэкватнасці той сітуацыі і гістарычнай справядлівасці.

Пазіцыя “Нашай Нівы” заставалася амаль нязменнай, яна паслядоўна даказвала, што беларуская мова і беларускі народ аб’ектыўна існуюць і з гэтым трэба лічыцца. Шлях, абраны рэдакцыяй выдання, быў слушны, яна не кідалася да абразаў і хлусні, яна была больш *ідэйным* выданнем, чым многія з яе апанентаў. Ёй удалося адстаяць правы беларускай мовы і дэ-факта дамагчыся прызнання апанентамі існавання адметнасці беларусаў.

У 1913 г. "Наша Ніва" змясціла артыкул "Хто страшней" [8, с. 1]. Там яна пісала, што ў "чарнасоценным" лагеры паўстала пытанне, каго цяпер лічыць больш небяспечным для расійскіх інтарэсаў у краі – беларусаў ці палякаў. Сама пастаноўка пытання сведчыла, што з беларускімі дзеячамі пачыналі сур'ёзна лічыцца.

Падчас вайны, як можна меркаваць з публіцыстыкі беларускага выдання, Л. Саланевіч і яго групоўка абвінавацілі "Нашу Ніву" ў непатрыятычных настроях. "Наша Ніва" ў сваю чаргу сцвярджала, што гэта "заходнерусы" найбольш шкодзяць інтарэсам Расіі, бо ў часе вайны сеюць варожасць паміж народамі краю.

Што датычыць "краёўцаў", іхняй падтрымкі беларускіх дзеячоў, з аднаго боку, а з другога – палемікі з "Нашай Нівай", то можна казаць, што "беларускія палякі" не падтрымалі беларускі рух і не стварылі яму альтэрнатыву, бо не сышлі з польскага грунту. Паланізацыя зайшла занадта далёка – пра гэта пісала "Наша Ніва". У складзе рэдакцыі тыднёвіка былі адрознымі пазіцыі А. Луцкевіча, які выступаў пэўны час на карысць "краёвай" ідэі, і В. Ластоўскага, які прапагандаваў апору выключна на ўласныя "мужыцкія" сілы. Разам з гэтым, яны аддавалі канчатковую перавагу "*этналінгвістычнай*" канцэпцыі нацыі, хоць пэўны час і былі прыхільнікамі "краёўства", ці канцэпцыі "*палітычнай*" нацыі.

У цэлым, сутнасць ідэйнага супрацьборства "Нашай Нівы" заключалася ў вызначэнні тоеснасці беларусаў. Выдаўцы газеты здолелі ўбачыць галоўную праблему 5 заходніх губерняў Расійскай імперыі, праблему нацыянальнай ідэнтычнасці "тутэйшых" яе насельнікаў і даць на яе цэласны адказ. Цэласны ў тым сэнсе, што нацыянальная ідэалогія, распрацаваная нашаніўцамі, датычылася ўсіх сфераў жыцця – палітыкі, культуры, эканомікі, рэлігіі. Можна толькі спрачацца, наколькі слушным быў гэты адказ, але нельга не пагадзіцца, што ён прагучаў выразна і недвухсэнсоўна – "тутэйшыя" – гэта беларусы, "паўночна-заходні край" – гэта Беларусь. Яна мае сваю культуру, гісторыю, а значыць – і права на самастойнае палітычнае жыццё.

Выкарыстаная літаратура

1. Цьвікевіч А. "Западно-руссизм". Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. Менск, 1993.

2. Смалянчук А. “Краёвасць” у беларускай гісторыі / http://old.kamunikat.org/www/czasopisy/almanach/01/01chronika.htm.
3. Белорус. Новый поход на Белорусию // Окраины Россiи. – 1908. – 29 марта.
4. Г.Б. З газэт // Наша Ніва. – 1912. – 10(23) траўн. – С. 2.
5. Abramowicz L. Nieporozumienie // Przegląnd Wileński. – 1912. – 5(18) maja – S. 1-2.
6. В.Л. Эліза Ожэшко // Наша Ніва. – 1910. – 13(26) траўн. (Факсімільнае выданне. Вып. 3. – Мінск: Тэхналогія, 1998. – 801 с.).
7. А-н-а. Край і народ // Наша Ніва. – 1912. – 19(1) ліп. – С. 3.
8. Б.С. Хто страшней // Наша Ніва. – 1913. – 15 сак. – С. 1.

## БЕЛАРУСЬ В ИМПЕРСКОМ ПРОСТРАНСТВЕ РОССИИ

Семенова Л.Н.г. Минск, БНТУ

Глупость Республики превосходит
все глупости Империи.
Г. Флобер

К концу XVIII в. имперское противоборство Речи Посполитой и России за территории с православным славянским населением Беларуси и Украины завершилось в пользу России и ее союзников. Речь Посполитая была поделена между тремя странами, сомкнувшими свои имперские границы. Большой удачей для Европы стало политическое, а не военное развязывание польского узла. У малых народов Центральной и Восточной Европы в то время практически не было шансов на формирование собственных государств. В рамках венской системы международных отношений ее главными арбитрами была позволена к существованию лишь узкая полоса небольших буферных государств в Западной Европе, призванных сдерживать имперские амбиции Франции и Пруссии. Только Османская империя постепенно стала разжимать имперские объятия в Европе, отпуская на свободу Грецию, Сербию, дунайские княжества, Болгарию и т.д. Наступало время немногочисленных империй эпохи капитализма и империализма, поделивших между собой весь мир. Не случайно известный английский историк Э. Хобсбаум назвал период с 1875 по 1914 гг. «Веком Империи». «Век Империи, – писал он, – громче других взывает о разоблачении